Ларыса Доўнар



# «Библиотечную профессию считаю одной из лучших»

*З рукапіснай спадчыны Я. С. Умецкай*

**Гонар факультэта, гонар беларускага кнігазнаўства – Яўгенія Сяргееўна Умецкая. Яна была адной з тых пачынальніц, хто аднойчы прыйшоўшы на бібліятэчны факультэт, карпатліва і творча працаваў, аддаючы і множачы веды пра кнігу і бібліятэчную справу.**

У аддзеле рэдкай кнігі БДУ культуры захоўваецца перададзены Я.С. Умецкай архіў, у якім знаходзіцца і аўтабіяграфія, напісаная самой Яўгеніяй Сяргееўнай (Фонд Умецкай, воп. 1, спр. 1, арк. 1–54)*. Паводле аўтабіяграфічных звестак зроблены і пададзены наступны матэрыял, які, спадзяюся, паслужыць на карысць і дапоўніць інфармацыю аб выдатнай вучонай, дазволіць дакрануцца да яе няпростага лёсу.

Яўгенія Сяргееўна нарадзілася ў сям'і служачых у Гомелі 17 лютага 1926 г. Бацька яе, Сяргей Панькоў, быў па паходжанню з сялян з вёскі Давыдаўка. Па ўспамінах Яўгеніі Сяргееўны, у сям'і бацькі валодалі граматай, займаліся самаадукацыяй, што вельмі паважалася сярод аднавяскоўцаў. Маці, як і бацька, закончыла прыходскае вучылішча, курсы тэлеграфістаў і была накіравана працаваць у адно з паштовых аддзяленняў Гомеля. Радзіма ж маці – Мінск. З вёскі Самахвалавічы, што пад Мінскам, быў дзед Яўгеніі Сяргееўны, які працаваў садоўнікам. Як адзначаецца ў аўтабіяграфіі, ён прымаў удзел у планаванні і заснаванні парка імя М.Горкага ў Мінску [арк. 36]. Бабуля па лініі маці была па паходжанню са збяднелых дваран, таму, каб забяспечыць сябе і сваю сям'ю, ёй прыходзілася таксама шмат працаваць, адкладваючы ў бок любімыя кнігі. Іх дом у Мінску, відаць, не выпадкова, знаходзіўся на колішняй Кірылаўскай вуліцы, якая цяпер мае назву Магілёўскай, паблізу якой размяшчаецца зараз наш універсітэт культуры...

У 1940 г. Яўгенія Сяргееўна закончыла сем класаў сярэдняй школы і паступіла ў Гомельскае педагагічнае вучылішча. Удалося правучыцца толькі адзін год, бо пачалася вайна і разам з Ваенным шпіталем, дзе ў той час працаваў бацька, сям'я падалася ў эвакуацыю на Алтай. Нягледзячы на вялікія цяжкасці, якія выпала перажыць, Яўгенія Сяргееўна змагла пасяхова скончыць 10-годку (1943 г.) [арк. 1]. Аднак далейшае навучанне прыйшлося на некаторы час адкласці, каб хоць крыху матэрыяльна падтрымаць сям'ю. Давялося папрацаваць на разгрузцы вагонаў, лаборанткай у хімлабараторыі спіртзавода, на нарыхтоўцы дроў, будаўніцтве плаціны і інш. Працоўны дзень доўжыўся да 12 гадзін. І ўсё ж у сям'і думалі, каб дзеці вучыліся і далей.

Дзякуючы «Пахвальнай грамаце» за 10-ты клас і выдатным адзнакам за 1-шы курс Гомельскага педвучылішча, 16 жніўня 1944 г. Яўгенія Сяргееўна без экзаменаў была залічана на гісторыка-філалагічны факультэт Бійскага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута [арк. 40]. Студэнцкае жыццё ў гады вайны было не для слабых, бо трэба было самім клапаціцца і пра ацяпленне свайго жылля, а гэта быў адзін з класаў інстытута, дзе мясцілася 14 чалавек, і пра харчаванне, якое ў лепшым выпадку ўяўляла вараную бульбу, – і на ўсё гэта трэба было зарабіць сваёй працай. Тым не менш, моладзь заставалася моладдзю і, калі выкладчык стараславянскай мовы А.А.Суслаў, як піша Яўгенія Сяргееўна, дзяліўся сваімі ўражаннямі аб наведванні студэнцкага інтэрната, то адзначыў, што калі б ён не заходзіў, – усе «смяюцца і смяюцца і толькі адна Панькова займаецца ў чытальнай зале» [арк. 41].

І, нарэшце, 9 мая 1945 г., у нядзелю пад гукі аркестра, які іграў у скверы «Развітанне славянкі», а студэнты рыхтаваліся да экзаменаў, прыйшла радасная вестка аб заканчэнні вайны.

* Усе спасылкі ў артыкуле прыводзяцца на дадзены фонд.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Дзве выдатныя адзнакі атрымала Яўгенія Сяргееўна ў гэты дзень [арк. 42]. Здаўшы датэрмінова экзамены за першы курс, яна разам з сям'ёй накіравалася дамоў, на Гомельшчыну. Аднак сустрэча з радзімай была вельмі горкай, бо на месцы роднага дома было толькі папялішча. Некаторы час сям'я Паньковых жыла ў сваякоў, якія выдзелілі ім пад жытло свой хлеў, потым перабраліся ў Смілавічы пад Мінск, дзе дала прытулак матчына сястра.

У першы пасляваенны год, як успамінае Яўгенія Сяргееўна, можна было паступіць у любую вышэйшую навучальную ўстанову [арк. 42]. І яна выбрала спецыяльнасць юрыста. Праўда, прыслухаўшыся да парады старэйшага брата, які не адобрыў будучай прафесіі, Яўгенія Сяргееўна пасля першага семестра перайшла вучыцца на другі курс бібліятэчнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя А.М.Горкага. Выбар бібліятэчнай спецыяльнасці адбыўся ўжо дзякуючы сяброўцы Раісе Чарнагубаўскай, аднакласніцы па Сакалоўскай школе (на Алтаі). Тым больш, што яна прапанавала і месца на сваім ложку ў інтэрнаце [арк. 42].

Не атрымліваючы матэрыяльнай дапамогі з дому, адначасова з вучобай Яўгенія Сяргееўна некаторы час падпрацоўвала ў якасці пагадзінніка разам з іншымі студэнтамі ў аддзеле апрацоўкі Дзяржаўнай, цяпер Нацыянальнай, бібліятэкі Беларусі, а таксама лабаранткай на кафедры бібліятэказнаўства [акр. 43].

Упершыню ж з бібліятэчнай працай Яўгенія Сяргееўна пазнаёмілася яшчэ летам 1942 г., калі на грамадскіх пачатках дапамагала загадчыцы бібліятэкі эвакуіраванага ў Бійск Ваеннага шпіталя.

У 1948 г. адбыўся першы выпуск на бібліятэчным факультэце. Сярод выпускнікоў была і Яўгенія Сяргееўна, якая атрымала дыплом выдатніка па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства». Ёй была прысвоена кваліфікацыя і званне «бібліятэказнаўца і выкладчык бібліятэчнай справы ў тэхнікумах» [арк. 2–3]. Месцам працы яна выбрала для сябе Абласную бібліятэку ў родным Гомелі, дзе на той час ужо жылі яе бацькі, сястра і брат, а таксама муж. Першай службовай пасадай у бібліятэцы, куды прыйшла працаваць, была пасада загадчыка аднаго з аддзелаў абанемента (перасовак і кнігасховішча). Праца кіраўніка была хоць і няпростай для маладога спецыяліста, аднак «цікавай, творчай і разнастайнай» [акр. 44]. Працуючы загадчыкам метадычнага аддзела (1953–1963), Яўгенія Сяргееўна набывала навыкі выкладання, беручы ўдзел у семінарах і бібліятэчных курсах. Разам з бібліятэчнай займалася таксама і лекцыйнай працай. Стаўшы членам Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў і Абласнога лекцыйнага бюро (1951–1963), чытала лекцыі на літаратурныя і маральныя тэмы на прадпрыемствах і ва ўстановах горада і вобласці [арк. 44].

З пераездам у 1963 г. у Мінск, па месцы прызначэння мужа, уладкавалася на працу ў Фундаментальную бібліятэку Акадэміі навук БССР, дзе да 1966 г. выконвала абавязкі старшага бібліёграфа, сумяшчаючы іх з метадычнай работай. З 1966 па 1971 г. працавала на пасадзе галоўнага бібліёграфа. Адной з бібліяграфічных прац Яўгеніі Сяргееўны ў той час быў бібліяграфічны паказальнік літаратуры па геаграфіі Беларусі (складзеная картатэка была перададзена на кафедру геаграфіі БДУ) [арк. 45].

У 1972 г. Я.С. Умецкая перайшла на педагагічную працу ў сваю alma mater, на бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута.

Навукова-даследчыцкія здольнасці Яўгеніі Сяргееўны праявілася яшчэ пры распрацоўцы метадычных матэрыялаў і складанні аглядаў дзейнасці бібліятэк Гомельшчыны, некаторыя з якіх былі надрукаваны [арк. 47]. Так, у 1957 г. выйшлі такія першыя работы, як «Организация и составление алфавитного каталога», «Работа библиотек передвижек (Из опыта работы)», «Описание опыта проведения читательской конференции по книгам К.П.Орловского «На высоком посту» и «Таким может стать каждый колхоз» культурно-просветительными учреждениями Гомельского района». Дзве наступныя публікацыі (1958, 1961) былі прысвечаны масавай рабоце сельскіх бібліятэк. Адна з іх была змешчана ў зборніку «Работа библиотек Республики» (1961), які выдаваўся Дзяржаўнай бібліятэкай БССР імя У.І. Леніна [арк. 53].

Пошукі сваёй навуковай місіі адчуваюцца і ў артыкулах, надрукаваных у часопісе «В мире книг» (1962. № 1), «Материалах научной конференции ФБАН БССР» (1965), зборніку «Библиотечно-библиографическая информация библиотек Академии наук СССР...» (1965. № 3), дзе аўтарам разглядалася роля грамадскіх сувязей у дзейнасці акадэмічных бібліятэк.

Грунтоўная і мэтанакіраваная навуковая дзейнасць Яўгеніі Сяргееўны пачынаецца з сярэдзіны 1960-х гг., калі яна цвёрда вырашыла займацца дысертацыйнай працай. Значную ролю ў вызначэнні тэмы дысертацыі сыгралі парады М.П. Стрыжонка і А.І.Мальдзіса, якія звярнулі ўвагу даследчыцы на прагалы ў вывучэнні гісторыі кнігі дарэвалюцыйнай Беларусі [арк. 47]. Тэма была таксама адобрана вядомым кнігазнаўцам, членкорам АН СССР А.А. Сідаравым [арк. 5–7]. У архіўным фондзе Я.С. Умецкай захоўваюцца некаторыя з пісем А.А. Сідарава за 1965–1966 гг.

У 1965 г. Я.С. Умецкая паступіла ў завочную аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН БССР. Упершыню пачутае ў дзяцінстве ад бацькі незнаёмае слова «аспірантура» стала для яе натуральнай жыццёвай явай [арк. 38–39]. Навуковае кіраўніцтва дысертацыйнай працай ажыццяўляў доктар гістарычных навук К.І. Шабуня. Яўгенію



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сяргееўну падтрымлівалі ў яе пачынанні і Г.Я. - Галенчанка, А.П. Грыцкевіч, А.І. Мальдзіс, П.Р. - Казлоўскі, А.А. Васілеўскі, В.У. Чапко (была апанентам) [арк. 47]. Першапачаткова хранала-гічныя межы навуковай працы ахоплівалі XIX – пачатак XX ст. і даследчыцы прыйшлося скрупулёзна выяўляць і збіраць неабходны матэрыял па гісторыі кнігадрукавання Беларусі ў бібліятэках і архівах Мінска, Гродна, Масквы, Ленінграда, Вільнюса, Кіева.

Пачынаючы з 1969 г. у друку з'яўляюцца артыкулы Я.С. Умецкай, прысвечаныя гісторыі выдавецкай і бібліятэчнай справы ў Беларусі: «Из истории издания газеты «Северо-Западный край» (Коммунист Белоруссии. 1969. № 10), «Газета «Северо-Западный край» и цензура» (Из истории книги, библиотечного дела и библиографии Белоруссии. 1970), «Цэнзурна-прававое становішча губернскіх ведамасцей» (Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1971. № 1), «Патаемная бібліятэка народнікаў» (Беларусь. 1972. № 6), «Предания старины белорусской» (Неман. 1972. № 7), «Полацк, 1817» (Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 4).

Пэўнымі адкрыццямі ў гісторыі кнігі Беларусі становяцца такія работы Яўгеніі Сяргееўны, як «Месечник полоцкий» – первый журнал дореволюционной Белоруссии» (1972), «Издательская деятельность Витебского центрального архива древних актов (1871–1906)» (1974), «Из истории книгоиздательской деятельности в г.Полоцке в первом тридцатилетии XIX в.» (1975), «Цензурно-правовое положение книги в Белоруссии (1800–1832 гг.)» (1975).

Значны фактаграфічны аб'ём сабранага навуковага матэрыялу, аналітычная і бібліяграфічная праца над ім прывялі да думкі ўсё ж абмежавання даследавання трыццацігадовым перыядам [арк. 49]. У канчатковым варыянце тэмай дысертацыі Яўгеніі Сяргееўны стала «История книгопечатания в Белоруссии в первой трети XIX в. (1801–1832 гг.)». У 1977 г. дысертацыя была паспяхова абаронена і 31 мая 1978 г. Я.С. Умецкая атрымала Вучоную ступень кандыдата гістарычных навук [арк. 52].

У канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг., дзякуючы знаходкам Яўгеніі Сяргееўны, беларускае кнігазнаўства ўзбагацілася першымі даследаваннямі, у якіх па-новаму раскрываўся свет кніжнай культуры Беларусі першага трыццацігоддзя XIX ст. Яе артыкулы аб прыватным кніга-друкаванні выходзяць у «Помніках гісторыі і культуры Беларусі» (1978. № 1; 1979. № 4); у навуковым зборніку «Вопросы библиотековедения и библиографии» друкуюцца матэрыялы крыніцазнаўчага характару па гісторыі беларускай кнігі (1981), асвятляецца роля «казённага» кнігадрукавання (1983), удзяляецца ўвага гісторыі распаўсюджання кнігі ў Беларусі (1980).

Яўгенія Сяргееўна актыўна ўдзельнічае ў шэрагу навуковых канферэнцый не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі: у Вільнюсе (1979), у Ленінградзе (1980, 1984, 1985), дзе таксама адбылося прызнанне яе як аднаго з вядучых даследчыкаў гісторыі кнігі Беларусі.

Як аўтарытэтны аўтар яна выступае са сваімі артыкуламі пра гісторыю выдавецкай і бібліятэчнай справы Беларусі ў энцыклапедычных выданнях: «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (1984–1986), энцыклапедычных даведніках «Магілёў», «Гомель», «Гродна» (1989–1991).

У 1986 г. у беларускім друку з'яўляецца унікальнае выданне – «Кніга Беларусі, 1517–1917: Зводны каталог», у якім прымае самы непасрэдны ўдзел і Я.С. Умецкая. Яе артыкул да трэцяй часткі каталога «Выданні на рускай мове. XIX – пач. XX ст.» і да гэтага часу застаецца актуальным і важкім пры вывучэнні гісторыі беларускага кнігавыдання.

Найбольш аб'ёмнай працай кнігазнаўцы з'яўляецца «История книгоиздательской деятельности в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века», якая была задэпаніравана ў 1990 г. У даследаванні падаецца грунтоўны матэрыял аб дзейнасці віленскай цэнзуры і мясцовых цэнзурных ведамстваў, разглядаецца дзейнасць царкоўных друкарняў (Магілёўскай кансісторыі, Полацкай езуіцкай акадэміі, Полацкага вышэйшага вучылішча ордэна піяраў, уніяцкага ордэна базыльянаў у Мінску); дзяржаўных і прыватных. Асобна вылучаецца агульная характарыстыка кнігавыдавецкай прадукцыі па тэматыцы, відах і характары выданняў.

На працягу 20-цігадовай педагагічнай дзейнасці, якую пачынала як асістэнт і закончыла ў 1992 г. з вучоным званнем дацэнта (з 1988 г.), Я.С. Умецкая распрацоўвала і чытала такія вучэбныя курсы, як «Сацыяльна-эканамічная бібліяграфія», «Гісторыя бібліяграфіі», «Бібліяграфічная работа ЦБС» і, зразумела, «Кнігазнаўства. Гісторыя кнігі», «Гісторыя беларускай кнігі».

За кіраўніцтва студэнцкімі навуковымі працамі, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах і адзначаліся Дыпломамі, Я.С.Умецкая была ўзнагароджана Ганаровымі граматамі (за 1982–1983 навуч. гг.). Яе актыўная творчая дзейнасць адзначалася і Таварыствам аматараў кнігі [арк. 46]. За значны ўклад у развіццё беларускага кнігазнаўства Яўгенія Сяргееўна ў 1977 г. атрымала медаль Ф. Скарыны.

Прайшоўшы шлях ад практыка бібліятэчнай справы да вядомага навукоўцы, Я.С.Умецкая да сённяшняга дня лічыць бібліятэчную прафесію адной з самых лепшых і таму, не парываючы прафесійных сувязей, прадаўжае нават на грамадскіх пачатках працаваць у бібліятэцы. Яўгенія Сяргееўна заставалася і застаецца прыкладам самаадданасці і вернасці сваёй адзінай на ўсё жыццё кніжнай справе.

Summary

L. Dounar's article is devoted to the biography of Yaugenia Umetskaya who was one of the first bibliographers in the library of the Belarusian University of Culture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ